## ДАДАТАК 1

## СТАТУТ ДУШПАСТЫРСКАЙ РАДЫ АРХІДЫЯЦЭЗІІ (ДЫЯЦЭЗІІ)

1. Рада абавязана выконваць прадпісанні кананічнага права.
2. На моцы права сам дыяцэзіяльны біскуп кіруе Радай.
3. Душпастырская рада па сваёй сутнасці з'яўляецца пастаянным органам у структуры партыкулярнага Касцёла, але адносна членаў і дзейнасці мае часовы характар. Склікаецца дыяцэзіяльным біскупам на тэрмін 5 гадоў.
4. Члены рады вывучаюць і аналізуюць душпастырскія праблемы і прадстаўляюць неабходныя меркаванні, каб дыяцэзіяльная супольнасць магла арганічна планаваць свае душпастырскія заданні і абавязкова выконваць іх.
5. Рада мае толькі дарадчы голас і склікаецца згодна з патрэбамі апостальства дыяцэзіяльным біскупам прынамсі раз у год.
6. Прадстаўляе прапановы ў сферы місіянерскай, катэхетычнай і апостальскай дзейнасці ў межах дыяцэзіі; у сферы дактрынальнай фармацыі і сакрамэнтальнага жыцця вернікаў; у сферы падтрымкі пастырскай дзейнасці святароў у розных грамадскіх групах парафіі або таксама ў тэрытарыяльных раёнах дыяцэзіі; у сферы фармавання штораз лепшай грамадскай думкі адносна спраў, звязаных з Касцёлам.